# Выстаўка дыпломных работ выпускнікоў БДУКМ адкрылася ва «Універсітэце культуры»

09.07.2024 **Аўтар:** **Яна Валасач**

**З 9 па 23 ліпеня ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» працуе выстаўка дыпломных работ выпускнікоў факультэта мастацкай культуры кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва БДУКМ.**




Тут можна азнаёміцца з дасягненнямі студэнтаў, якія створаны ў 2023-2024 вучэбным годзе. Выпускнікі прэзентуюць работы ў розных відах і напрамках сучаснага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, такія як: кераміка, ткацтва, батык і многія іншыя. Маладыя творцы стварылі прыгажосць пад кіраўніцтвам выкладчыкаў кафедры — вопытных майстроў і сапраўдных прафесіяналаў сваёй справы.

Дарэчы, кафедра дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускі дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў больш за дваццаць пяць гадоў паспяхова ажыццяўляе педагагічную, выхаваўчую навукова-даследчую дзейнасць у галіне народнага мастацтва.

За гэты перыяд падрыхтавана значная колькасць спецыялістаў, якія займаюцца педагагічнай, творчай і навуковай дзейнасцю ў нашай краіне, працягваюць працу па адраджэнні, захаванні, развіцці і трансляцыі традыцыйнага народнага мастацтва ў сацыякультурнай сферы сучаснага грамадства.

Шырокі спектр тэм, шматграннасць тэхнік і ўнікальны стыль — на выстаўцы ў галерэі мастацтваў «Універсітэт культуры». **Прыходзьце і захапляйцеся!**